ад бібліяграфіі рэгулярнага бібліяграфічнага інфармавання аб друкаваных выданнях.

Межы наступнага перыяду вызначаюцца пастановай Саўнаркома рэспублікі Беларусь ад 15.09.22 г. "Аб заснаванні Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі і абавязковай рэгістрацыі усіх друкаваных выданняў", якая паслужыла пачаткам арганізацыйнага афармлення агульнай бібліяграфіі. Для развіцця беларускай навукова-дапаможнай бібліяграфіі вялікае значэнне мела утварэнне у 1929г. пры Савеце народных камісараў Беларусі вышэйшай дзяржаўнай і навукова-даследчай установы рэспублікі – Інстытута беларускай культуры. Для упарадкавання і вядзення бібліяграфічнай дзейнасці 21 красавіка 1925 г. пры Інбелкульце была створана бібліяграфічная камісія. Цэнтрам рэкамендацыйнай бібліяграфіі у 20-я гг. стаў палітыка-асветніцкі аддзел Наркамсроса Беларусі, у прыватнасці, яго клубна-бібліятэчны аддзел. Завяршаецца гэты перыяд 1929 годам, калі адбываецца паступовае скарачэнне грамадскіх арганізацый, якія прымалі актыўны удзел у бібліяграфічнай дзейнасці рэспублікі. Пад лозунгам барацьбы з нацыяналізмам дэмакратычныя традыцыі беларускай бібліяграфіі былі прыпынены і дэфармаваны. З пачатку 30-х гадоў бібліяграфічнай дзейнасцю займаюцца толькі дзяржаўныя арганізацыі і яна поўнасцю падмяняецца ідэалагічнымі устаноўкамі, якія панавалі у перыяд культу асобы І.В.Сталіна.

## БЕЛАРУСКІ МУЗЫЧНЫ ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР У ВЫХАВАННІ БУДУЧЫХ КІРАЎНІКОЎ АМАТАРСКІХ ДЗІЦЯЧЫХ ХАРАВЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

У.Д.Каструлеў

Беларускі народ стварыў сваю адметную культуру, важнае месца сярод якой належыць народнай творчасці.

Ужо у першыя гады жыцця чалавека, фарміруюцца тыя пачуцці, рысы характару, якія звязваюць яго са сваім народам, сваей краінай. Родная мова, якую засвойвае дзіця, знаёмячыся з народнымі песнямі, музыкай, казкамі, гульнямі, з'яўляецца тым падмуркам, на якім вырастае потым пачуцце Радзімы.

Радзіма паўстае перад дзіцяці ў вобразах, гуках, малюнках, якія замацаваны ў творах свайго народа. Дзякуючы роднай песне, казке, гульням дзіця знаёміцца з роднай мовай, атрымлівае першыя ўяўленні аб культуры свайго народа.

Здаўна ведалі ў народзе, што дзіця з маленства ўспрымае музыку, і таму адносіліся вельмі сур'ёзна да музыкі як сродку выхавання. Беларускі музычны фальклор, вусна-паэтычная творчасць народа з'яўляюцца каштоўным матэрыялам для развіцця нацыянальнай мовы, пачынаючы з першых крокаў жыцця дзіцяці. Свет песень, казак, гульняў вельмі зразумелы дзецям з першых год жыцця. Вобразы гэтых твораў выхоўваюць мужнасць, дабрыню, высакароднасць пачуццяў, спрытнасць, кемлівасць і многія іншыя якасці. Педагагічная карысць песен, напеваў, прымавак, пацешак заключаецца ў тым, што дае магчымасць без "сухіх" натацый, у прыемнай форме для дзіцяці вывучыць яго пэўнаму жыццёваму навыку. Народная творчасць даступна і зразумела таму, што яна вобразная, адпавядае дзіцячаму ўспрыманню, мысленню. Дзіцячы свет выступае ў фальклоры, у разнастайным багацці вобразаў, меткіх параўнанняў, народнай мудрасці, чароўных гукаў песенных і інструментальных мелодый, рытмаў, рухаў, у якіх адлюстраваны рысы характару народа, яго душа. У сістэме выхавання важна выкарыстоўваць усе віды народнай творчасці. Пры гэтым дзяцей трэба знаёміць з такімі народнымі песнямі, гульнямі, казкамі, танцамі, якія ім зразумелы і цікавы, адпавядаюць нашым сённяшнім эстэтычным патрабаванням. Гэта павінна ўлічвацца пры адбору фальклорнага матэрыялу. Толькі тады, калі народная творчасць сапраўды адпавядае крытэрыям сучаснага густу, цікава дзецям, яна можа арганічна, а не штучна ўвайсці ў іх жыццё.

Тыя веды, якія атрыманы ад знаёмства з фальклорам, арганічна замацоўваюцца і пашыраюцца на другіх занятках. Напрыклад, на занятках па развіццю мовы дзеці могуць спяваць калыханку, укладваючы лялечку спаць, па характару музыкі здагадвацца аб асноўных рысах паводзін ваўка, зайчыка, козліка, верабейчыка і г.д.

Менавіта таму, найбольш аптымальным спосабам выхавання дзяцей ранняга ўзросту з'яўляецца прынцып міжпрадметных сувязей, які лепш за ўсё рэалізаваць, выкарыстоўваючы традыцыйны фальклор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры падборы песеннага фальклору трэба улічваць не толькі якго яскравасць, мастацкасць і прастату, але і вакальныя магчымасці дзіцячага голасу, асаблівасці яго пабудовы і развіцця.

Шырокая палітра жанраў беларускага фальклору, якая адпавядае ўзроставым і мастацкім магчымасцям дзяцей, дае ўяўленне аб незвычайным багацці беларускага фальклору, спрыяе развіццю разнастайных мастацкіх задаткаў і здольнасцей дзяцей.

## СУЧАСНЫЯ ПРАБЛЕМЫ АМАТАРСКАЙ ХАРАВОЙ ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСІ

Я.М.Рэутовіч

Духоўнае, культурнае жыццё народа разам з іншымі кампанентамі ўключае і заняткі творчай дзейнасцю, без якой не магчыма эстэтычнае выхаванне і ўсебаковае развіццё асобы.

Асноўваючы мастацкую самадзейнасць у педагагічным аспекце, трэба адзначыць, што само гэта паняцце удакладнілася толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, як з'ява новая, якасна адрозніваючаяся ад фальклорнай і аматарскай творчасці у ранейшым паразуменні.

Чым жа адрозніваецца мастацкая самадзейнасць ад фальклорнай і аматарскай дзейнасці?

Перш за ўсе гэта розніца ў тым, што наша мастацкая самадзейнасць нарадзілася і развіваецца, як масавы рух працоўных, у якім ініцыятыва народа падтрымліваецца і накіроўваецца дзяржаўнымі прафсаюзнымі установамі.

Фальклорная ж і аматарская творчасць ажыццяўляецца на ініцыятыве і за матэрыяльныя сродкі саміх удзельнікаў або мецэнатаў (спонсараў).

Адной з галоўных праблем сучаснай харавой творчасці, на наш погляд, з'яўляецца не фактычны пераход з статусу самадзейнай у аматарскую. Да гэтага часу, так званай перабудовы, аб развіцці мастацкай самадзейнасці клапаціліся дзяржаўныя і прафсаюзныя установы, накіроўваючы яе развіццё і ствараючы неабходныя матэрыяльныя і арганізацыйныя умовы.

Рэспубліканскія і абласныя навукова-метадычныя цэнтры [illegible]



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ